## Першы накід рэзалюцыі Беларускай Канфэрэнцыі ў культурна–нацыянальных справах

Канфэрэнцыя жадае[1]:

1. Каб на ўсіх урадовых друках, у каторых уласьці зьвяртаюцца да народу на Беларускай зямлі, ужывалася беларуская мова (позвы, павесткі і інш.) і каб на „нямецкіх рублях“ былі беларускія надпісы.

2. Каб выдаваныя ў Гродні і Беластоку ўрадовыя газэты ў нямецкай, польскай і жыдоўскай мовах выходзілі і зь беларускім тэкстам.

3. Каб у часе трываньня ваеннага стану не былі робленыя ніякія новыя сьпісы жыхароў[2], каб зробленыя ўжо нямецкія сьпісы былі прызнаны няправільнымі і каб нямецкія ўласьці апіраліся на даных старой расейскай статыстыкі 1897 году.

4. Каб у Віленскім мястовым Байраце і іншых падобных установах, дзе ёсьць прадстаўнікі грамадзянства, канечне былі і прадстаўнікі беларусаў[3].

## Другі накід рэзалюцыі Беларускай Канфэрэнцыі ў культурна–нацыянальных справах

Прынімаючы пад увагу:

1. што друкаваньне нямецкімі акупацыйнымі ўласьцямі папяровых грошы („нямецкія рублі“), урадовых позваў і апавестак і ўрадовых газэт (у Беластоку[1] і Гродні), ужываючы спаміж славянскіх моў толькі аднэй польскай і выключаючы беларускую, умаляе правы беларускага народу і прымушае яго карыстацца чужой польскай мовай;

2. што ў чыста беларускіх ваколіцах, дзе пераважывае каталіцкае насяленьне, нямецкія ўласьці адкрываюць для народу школы польскія, а не беларускія, і гэтак прымушаюць беларускіх дзяцей вучыцца ў чужой ім польскай мове,

— Беларуская Канфэрэнцыя пратэстуе проці такой палітыкі нямецкіх уласьцей як шкоднай для беларусаў і паддзержываючай палянізацыйную работу.

## Рэзалюцыя ў справах праваслаўнай цэркві

Зьезд дамагаецца:

1) каб на кошт эпархій была арганізавана камісія дзеля перакладу на беларускую мову набожных[1] кніг, друкаваўшыхся дагэтуль па–рас[ейску][2], і надрукаваньня іх;

2) каб былі адкрыты нанова праваслаўныя духоўныя сэмінарыі і каб навучаньне ў сэмінарыях адбывалася ў беларускай мове;

3) каб праваслаўныя сьвяшчэньнікі ў пропаведзях і ў навучаньні веры ўжывалі не расейскай, а беларускай мовы.

## „Беларусь за Познаншчыну“

Нядаўна „Dziennik Polski“ (у № 20 з 20. I.1918) выкрыў дужа цікавы плян абмена Беларусі на Познаншчыну.

Плян гэты ўлажыў вядомы нямецкі нацыяналіст — праф. Рорбах, каторы да апошніх часоў быў вялікім прыяцелем палякаў, а цяпер запісаўся ў члены нямецка–літоўскага таварыства ў Бэрліне. Праф. Рорбах суліць Польшчы занятыя немцамі Беларускія землі за тое,